УДК 811.161.3'367

А. В. Доўгаль

# СТРУКТУРНЫЯ І СЕМАНТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЭМАТЫЎНЫХ ВЫКАЗВАННЯЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

В статье рассматриваются структурные и семантические особенности эмотивных высказываний. По структуре эмотивные высказывания делятся на два типа: 1) эмотивные высказывания, построенные по эмотивным синтаксическим моделям; 2) эмотивные высказывания с маркерами эмотивности. С позиции семантики эмотивные высказывания выражают: 1) эмоциональное состояние субъекта; 2) эмоциональное отношение субъекта к объекту.

The article deals with semantic and structural features of emotive sayings. According to the structure all the emotive sayings are divided into two types: 1) emotive sayings, built on emotive syntactic patterns; 2) emotive sayings with markers of emotiveness. According to the semantics all the emotive sayings express: 1) emotional state of subject; 2) emotional attitude of the subject to the object.

*Ключевые слова*: белорусский язык, эмотивное высказывание, эмотивная синтаксическая модель, маркер эмотивности, эмоциональное состояние, эмоциональное отношение.

*Key words*: Belarusian, emotive saying, emotive syntactic pattern, marker of emotiveness, emotional state, emotional attitude.

Эматыўныя выказванні разглядаюцца намі як сінтаксічныя адзінкі, якія ўжываюцца ў маўленні для выражэння эмоцый і пачуццяў моўцы. Сферай ужывання такіх канструкцый з'яўляецца гутарковае маўленне. Эматыўныя выказванні валодаюць цэлым шэрагам дыферэнцыйных прымет. У прапанаваным артыкуле будуць разгледжаны структурныя і семантычныя асаблівасці такіх выказванняў.

**Структурныя асаблівасці эматыўных выказванняў.** Паводле структуры эматыўныя выказванні падзяляюцца на: (1) выказванні са спецыялізаванымі маркёрамі эматыўнасці; (2) выказванні, пабудаваныя паводле пэўных сінтаксічных мадэляў [2, с. 7].

**Маркёры эматыўнасці** – гэта "кампаненты эматыўных выказванняў, якія ўтвараюць іх эмацыйную рамку" [1, с. 24]. Іх можна лёгка вычленіць са структуры выказвання, і пры гэтым само выказванне не стане аграматычным, але зменіцца яго камунікатыўная мэта, напр.: *Ён **што**, аднарукі, сляпы, кульгавы?* (А. Дудараў "Парог") → *Ён аднарукі, сляпы, кульгавы. (?)*; ***Як** ты не разумееш?* (І. Шамякін "Абмен") → *Ты не разумееш. (?)*; ***Хіба** ты госць? Ты член сям'і.* → *Ты госць? Ты член сям'і.* Трансфармаваныя выказванні паводле мэтавай устаноўкі з'яўляюцца эмацыйна нейтральным паведамленнем або пытаннем, але адпаведная інтанацыя можа надаць ім эмацыйную афарбоўку: эмоцыя здзіўлення або абурэння накладаецца на паведамленне або пытанне і становіцца эматыўным кампанентам агульнай семантыкі выказвання. Наяўнасць жа маркёраў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(часціц *што, як, хіба*) у структуры выказвання – гэта фармальная прымета эматыўнасці выказвання.

**Сінтаксічныя мадэлі** – гэта сінтаксічныя ўзоры, паводле якіх утвараюцца эматыўныя выказванні; гэта "замацаваныя ў мове спосабы выражэння эмацыйнай рэакцыі моўцы на аб'ектыўную рэальнасць ці маўленне суразмоўцы, якія валодаюць рэгулярным узнаўленнем у маўленні" [1, с. 3]. Такія сінтаксічныя ўзоры можна прэзентаваць у выглядзе граматычнай формулы. Яны належаць да фразеалагізаваных сінтаксічных адзінак. Напр., выказванне *Таксамо мне гаспадары!* (А. Карпюк "Карані") пабудавана па мадэлі *таксама + мне + (Adj)* $N_{1,4}$ + $(V_f)$, дзе *таксама + мне* – нязменны абавязковы складнік; $N_{1,4}$ указвае на граматычную форму пераменнага кампанента – гэта назоўнік у назоўным ці вінавальным склоне; сімваламі *(Adj)* і $(V_f)$ пазначаны граматычныя асаблівасці магчымых факультатыўных адзінак. Па дадзенай мадэлі можна ўтварыць мноства канкрэтных ацэначных выказванняў, што выражаюць адмоўную эмоцыю – незадавальненне, якая з'яўляецца тыпавым значэннем мадэлі. Паводле сінтаксічнай мадэлі *а + яшчэ + (Adj)* $N_{1,5}$ + *(называцца)* утвараюцца выказванні са значэннем 'расчараванне', напр.: *Не даеш ты веры. Э-эх, а яшчэ сяброўкай называешся!* (А. Карпюк "Белая дама"); *Усё трусіш! Усё хаваешся! А яшчэ франтавік!"* (А. Карпюк "Карані").

**Семантычныя асаблівасці эматыўных выказванняў.** З пазіцыі псіхалогіі, эмоцыі маюць некалькі асаблівасцей: "па-першае, эмоцыі выражаюць стан суб'екта і яго стаўленне да аб'екта; па-другое, эмоцыі звычайна адрозніваюцца палярнасцю, г. зн. валодаюць станоўчым або адмоўным знакам: задавальненне – незадавальненне, весялосць – сум, радасць – смутак і да т. п." [3, с. 245]. Такая спецыфіка эмоцый знайшла сваё адлюстраванне пры семантычнай класіфікацыі эматыўных сінтаксічных адзінак на (1) выказванні, што характарызуюць эмацыйны стан асобы, (2) выказванні, што выражаюць эмацыйнае стаўленне чалавека да рэчаіснасці.

Крытэрыем для такой семантычнай дыферэнцыяцыі выказванняў з'яўляецца наяўнасць аднаго (суб'ект) або двух (суб'ект і аб'ект) удзельнікаў эмацыйнай сітуацыі. Згодна з гэтым, першы тып выказванняў з'яўляецца ненакіраванай эмацыйнай рэакцыяй, другі тып – накіраванай. Выражэнне эмацыйнага стану ці эмацыйнага стаўлення з'яўляецца істотнай семантычнай прыметай класа эматыўных выказванняў.

Паводле семантыкі эматыўныя выказванні, якія характарызуюць стан чалавека, з'яўляюцца ўласна эматыўнымі (перадаюцца толькі эмоцыі), напр.: *Няўжо ты не ведала пра яе захапленне фэн-шуй?* (уласны запіс) (здзіўленне). У выказваннях, якія выражаюць стаўленне, эмоцыі спа-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лучаюцца з ацэнкай, напр.: *Што за характар!* (уласны запіс) (абурэнне адмоўная ацэнка); *Які голас!* (уласны запіс) (захапленне – станоўчая ацэнка). Эматыўна-ацэначныя выказванні неабходна адрозніваць ад выказванняў кшталту *Гэта быў цудоўны спектакль*; *Сёння жудаснае надвор'е* і пад. У іх рэалізавана рацыянальная ацэнка, індыкатарам якой выступаюць ацэначныя словы – прыметнікі *цудоўны* і *жудаснае.* Змест такіх выказванняў выражае не эмоцыі, а меркаванне моўцы (суб'екта ацэнкі) адносна пэўных аб'ектаў рэчаіснасці.

'Эмацыйны стан суб'екта маўлення' і 'эмацыйнае стаўленне суб'екта маўлення' з'яўляюцца асноўнымі тыпавымі значэннямі для сінтаксічных мадэляў эматыўных выказванняў.

Спецыфіка семантыкі сінтаксічных мадэляў эматыўных выказванняў абумоўліваецца ў пэўнай ступені лексічным замяшчэннем пазіцый пераменных, а таксама факультатыўных кампанентаў. Напр., тыпавое значэнне мадэлі *што + (гэта) + за + (Adj)* $N_1$ дакладна можна вызначыць толькі прааналізаваўшы магчымыя варыянты маўленчай рэалізацыі, калі "вакантныя месцы" запаўняюцца канкрэтнымі лексемамі. Так, семантычную дыферэнцыяцыю выказванняў *Што за чалавек!* (А. Карпюк "Карані"); *Што гэта за сям'я!* (І. Шамякін "Слаўся, Марыя!"); *Што за манеры!* (уласны запіс) немагчыма правесці па-за кантэкстам ці сітуацыяй маўлення і без адпаведнага інтанацыйнага афармлення; у ізаляваным выглядзе яны маюць некалькі значэнняў. Разам з тым выказванні, пабудаваныя па гэтай жа схеме, кшталту *Глядзі ты, што за макрэнь!* (А. Карпюк "Карані"); *Што за глупства!* (уласны запіс); *Што за бегатня!* (уласны запіс) маюць адназначную семантыку і без апісання сітуацыі: усе яны перадаюць адмоўную эмацыйную ацэнку з'яў рэчаіснасці, выражаюць незадавальненне. А ў выказваннях тыпу *Што за прыгажосць навокал!; Што за смакоцце!* выражаецца адваротнае: 'станоўчая ацэнка', 'захапленне'. Як відаць, адной сінтаксічнай мадэлі адпавядаюць як два розныя тыпавыя значэнні: 'незадавальненне' (адмоўная эмоцыя) і 'захапленне' (станоўчая эмоцыя), якія ў пэўнай ступені залежаць ад лексічнага значэння пераменнага кампанента $N_1$: словы *макрэнь, глупства, бегатня* ўтрымліваюць адмоўную ацэначную сему, а словы *прыгажосць, смакоцце* – станоўчую. Але больш карэктна вызначаць стасункі паміж асобнымі лексемамі і цэлымі выказваннямі як узаемаабумоўленыя: семантыка ўсяго выказвання вызначаецца асобнымі словамі, як і значэнне апошніх у канкрэтным выказванні залежыць ад інтанацыі, кантэксту і пазамоўнай сітуацыі. Напр., выказванне *Што за дзянёк сёння!* можа выражаць супрацьлеглыя (станоўчыя і негатыўныя) эмоцыі: захапленне, радасць або раззлаванасць, незадавальненне, ня-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гледзячы на наяўнасць лексемы *дзянёк* з памяншальна-ласкальным суфіксам. Значыць, па лексічным складзе выказвання, ужытага па-за кантэкстам, можна толькі спрагназаваць, але не вызначыць яго дакладную семантыку. Ацэначныя словы бяруць на сябе частку эматыўнай семантычнай нагрузкі, пазбаўляючы гэтага інтанацыю; наадварот, у выказваннях без іх галоўным сродкам выражэння эмоцый з'яўляецца інтанацыя, падмацаваная жэстамі і мімікай.

Пэўныя ўдакладненні ў семантыку выказванняў уносяць таксама словы, што замяшчаюць факультатыўныя пазіцыі ў структурнай схеме, у дадзеным выпадку гэта прыметнікі, напр.: *Што за **дурныя** намёкі!* (І. Шамякін "Слаўся, Марыя!"); *Што за **агідная** пагода!* (А. Карпюк "Карані"); *Што за **чароўная** музыка!* (уласны запіс) ды інш. Ацэначныя прыметнікі могуць выконваць функцыю ўзмацнення эматыўнай семантыкі, напр.: *Што за манеры! Што за **ідыёцкая** манера пастаянна спазняцца!* ці *Што за манеры! Што за **цудоўная** манера выканання раманса!* Выказванні размяшчаюцца па прынцыпе ўзыходнай градацыі эмоцый, у першым выпадку адмоўнай, у другім – станоўчай.

Такім чынам, эматыўныя выказванні з'яўляюцца асобным камунікатыўным тыпам выказванняў, якія вылучаюцца на падставе дамінавання эмацыйнага складніка над рацыянальным у змесце выказвання, што праяўляецца і ў іх функцыі – выражаць (а не называць або апісваць) эмоцыі чалавека.

Эматыўныя выказванні маюць шэраг асаблівасцей. Па-першае, іх эматыўнасць абумоўлена або наяўнасцю ў структуры адпаведных маркёраў, або самой сінтаксічнай структурай. У апошнім выпадку яны ўтвараюцца паводле пэўных сінтаксічных мадэляў, што належаць да фразеалагізаваных структурных схем. Кожнай мадэлі ўласціва сваё тыпавое значэнне. Па-другое, паводле семантыкі адрозніваюцца ўласна эматыўныя выказванні (яны характарызуюць эмацыйны стан моўцы) і эматыўна-ацэначныя (выражаюць эмацыйнае стаўленне да рэчаіснасці). Па-трэцяе, семантыка таго ці іншага эматыўнага выказвання ў пэўнай ступені абумоўлена лексічным значэннем слоў-складнікаў.

## Літаратура

1. *Пиотровская, Л. А.* Эмотивные высказывания в современном русском языке : учеб. пособие / Л. А. Пиотровская. – Санкт-Петербург : Образование, 1993. – 71 с.

2. *Пиотровская, Л. А.* Эмотивные высказывания как объект лингвистического исследования / Л. А. Пиотровская. – Санкт-Петербург : СПбГУ, 1994. – 147 с.

3. *Рубинштейн, С. Л.* Эмоции / С. Л. Рубинштейн // Психология эмоций : учеб. пособие для студ. вузов, обуч. по напр. и спец. психологии / сост. В. Вилюнас. – Санкт-Петербург : Питер, 2006. – С. 244–256.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова